СЦЯПАН БАМБІЗА: «ІМКНЁМСЯ ПРЫЦЯГВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ»



Пра тое, чым прыцягальнае беларускае Палессе і чым адметны сёлетні фестываль «Кліч Палесся», гутарым з генеральным дырэктарам Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпанам БАМБІЗАМ.

— Правядзенне фестывалю ў міжнародным маштабе — адзін з пунктаў Дзяржаўнай праграмы па развіцці Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Яго мэта — не толькі падкрэсліць самабытнасць і ўнікальнасць рэгіёна ў культурных і этнічных адносінах, але і прыцягнуць у гэты куточак Палесся інвестараў і турыстаў. Калі ўзгадаць адносна недалёкую гісторыю, 90-я гады мінулага стагоддзя, Палессе ў той час ператваралася ў закінуты край: у людзей было адчуванне непатрэбнасці. Вось тады Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка наведаў гэтыя мясціны і пабачыў на свае вочы патэнцыял краю. Паступова ў дзяржаве стаў наводзіцца парадак, пачалі адраджацца прамысловыя цэнтры, а потым і Палессе. У першую чаргу перад намі была пастаўлена задача прывесці ў парадак прыродаахоўныя тэрыторыі, чым мы і займаемся. А потым прыйшоў час падумаць пра святы і адраджэнне традыцый. Для нас жа аднолькава важна захаваць і ўнікальны прыродны комплекс, і мясцовыя традыцыі. А падтрымка кіраўніка дзяржавы надала нам сіл і энергіі, таму мы з энтузіязмам пачалі гэтую справу. Бабулькі і дзяўчаты сёння рыхтуюць да свята свае строі, іх твары свецяцца. Яны заклікаюць усіх прыйсці і паспрабаваць прысмакі, якія нагатавалі. Гэта свята для людзей робіцца.

— Ці павялічылася апошнім часам колькасць наведвальнікаў парку, у тым ліку замежных? Што прываблівае тых,



Тут размясціўся музей прыроды.

хто прыязджае на Прыпяць папаляваць і адпачыць?

— Паляўнічая гаспадарка ў Нацыянальным парку — гэта асобная галіна. У нас сэрвіс на ўзроўні сучасных паляўнічых гаспадарак Еўропы. Мы працуем на будучыню — завезлі вялікую колькасць аленяў. Для паляўнічых прадастаўляем трафеі, задавальняем усе запыты і патрэбы. Да нас прыязджае шмат еўрапейцаў, і яны пакідаюць тут немалую капейку, за апошнія пяць гадоў павялічылася колькасць расіян. Усіх прываблівае не толькі прыгажосць прыроды, але і высокая арганізаванасць, парадак, гарантыя, што адпачынак пройдзе на высокім узроўні. Дарэчы, з Масквы сюды можна дабрацца за 8—10 гадзін.

Правядзенне фестывалю ў міжнародным маштабе — адзін з пунктаў Дзяржаўнай праграмы па развіцці Прыпяцкага Палесся

— Як развіваецца водны турызм на Прыпяці?

— Унікальны прыродны комплекс, які фарміруе рака Прыпяць, адзіны ў Еўропе. Толькі рэкі Сібіры могуць параўноўвацца па прыгажосці і магутнасці з нашай ракой. Калі падымаешся на паветраным шары або верталёце над Прыпяццю, бачыш пойму, тысячы рачулак, старыцы, затокі, пратокі, балаты, лясныя астраўкі... Падчас паводкі ўсё гэта аб’ядноўваецца ў адзіную прастору, у старадаўнія часы названую Герадотавым морам. Вось тады разумееш веліч магутнай Прыпяці... Яе ж можна параўноўваць з самымі знакамітымі сусветнымі прыроднымі комплексамі: з Нілам ці Амазонкай. Нездарма ў кнізе «300 самых унікальных месцаў на Зямлі» ёсць і Нацыянальны парк «Прыпяцкі». У нас вялікія магчымасці развіваць водны турызм. Тут можна пакатацца і на цеплаходах, на маторных і драўляных лодках, — як каму падабаецца. Мы займаемся не толькі прагулкамі па Прыпяці, але і перавозкамі па вадзе. Гэта перспек-

тыўны напрамак. Не абавязкова ехаць у паўднёва-ўсходнюю Азію, каб пабачыць унікальную прыроду. Прыгажосць ёсць і ў нас. І я ўсіх заклікаю яе пабачыць. Мы прадстаўляем Нацыянальны парк «Прыпяцкі» на розных выставах як у Беларусі, Расіі, так і ў Еўропе — імкнёмся прыцягваць людзей. Між іншым, чым больш свет ахоплівае глабалізацыя і навукова-тэхнічны прагрэс, тым большы інтарэс людзей да прыроды, да сваіх вытокаў і каранёў.

— Як працуе музей прыроды Нацыянальнага парку «Прыпяцкі»? Чым ён здзіўляе наведвальнікаў?

— Наяўнасць музея прыроды — абавязковы атрыбут усіх нацыянальных паркаў. Наш музей прыроды — самы малады, але таму і лепшы ў Беларусі, бо мы ўлічылі найноўшыя тэндэнцыі і тэхналогіі. У музеі прадстаўлена не толькі прырода краю, але і быт, мясцовыя рамёствы палешукоў. Адна з галоўных задач — экалагічнае выхаванне насельніцтва і асабліва дзяцей. Як толькі пачынаюцца летнія канікулы, да нас адразу ж накіроўваюцца на экскурсіі школьнікі. За дзень мы прымаем да 800—1000 чалавек. У нас ёсць магчымасць паказваць дыяграмы, фільмы, слайды, чытаць лекцыі... Гэта справа вельмі патрэбная, і мы абавязаны ёй займацца.

Унікальны прыродны комплекс, які фарміруе рака Прыпяць, адзіны ў Еўропе. Толькі рэкі Сібіры могуць параўноўвацца па прыгажосці і магутнасці з нашай ракой

— Раскажыце пра фотавыставу «Зачараванне Палесся». Работы якіх фотамастакоў можна будзе ўбачыць?

— У канцы жніўня ў Беларусі завяршыўся фотапленэр Беларускага грамадскага аб’яднання «Фотамастацтва» ў межах міжнароднага фотапраекта «Увага: усмешачку!». У ім прынялі ўдзел 16 фатографаў з Беларусі, Украіны, Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Малдовы. За 7 дзён беларускія і замежныя



Блакітная дарога Прыпяці.

Паляўнічая гаспадарка ў Нацыянальным парку — гэта асобная галіна. У нас сэрвіс на ўзроўні сучасных паляўнічых гаспадарак Еўропы

фатографы ўбачылі каларыт беларускага жыцця, у тым ліку наведалі Нацыянальны парк «Прыпяцкі». Мы плануем разам са знакамітым беларускім фотамастаком Сяргеем Плыткевічам паказаць некаторыя работы у межах фотавыстаў нашага фестывалю. Спадзяюся, што яны потым застануцца ў нашым музеі прыроды, дзе ёсць спецыяльная зала для гэтых мэт. Чым больш жывеш на свеце, тым больш захапляешся прыродай. У мяне такая магчымасць ёсць. Канешне, ёсць жаданне зафіксаваць і паказаць усім гэтую прыгажосць. Менавіта таму на фотавыставе будуць прадстаўлены і мае работы.

— Сцяпан Мікалаевіч, вы тут, у Нацыянальным парку «Прыпяцкі», ведаеце не тое што кожны куток, а кожнага звера «ў твар». І вас яшчэ шмат што здзіўляе?

— А як не здзіўляцца, калі выбіраешся пасля цяжкага працоўнага дня на прыроду і столькі цудаў бачыш! Нядаўна назіраў з вышкі, як на паляне два зайца гулялі між сабой. Потым бачу — яны насцярожыліся і пачалі глядзець у адзін бок, туды, адкуль да іх падкрадвалася лісіца. Адзін адразу збег, а другі, калі лісіца да яго кінулася, ад яе пабег па паляне. Ліса спынілася і пайшла назад, заяц да яе павярнуўся і некалькі разоў хлопнуў лапамі і такі гук выдаў: «Хохохо». Лісіца развярнулася і давай даганяць зайца. Ён зноў па кругу ад яе бяжыць. Не дагнала, хоць ён доўга з ёй так дражніўся і выклікаў гульню. Такіх цудаў можна шмат тут пабачыць. У прыродзе гарманічна ўсё, звяры адно аднаго добра разумеюць і могуць дамовіцца — у адрозненне ад некаторых людзей.

— Фестываль «Кліч Палесся» змяніў фармат і стаў міжнародным. Якімі разынкамі будзеце здзіўляць?

— Сёлета пройдзе трэці фестываль «Кліч Палесся», які цяпер атрымаў статус міжнароднага, а значыць, вырас яго маштаб. Сёлета да нас прыязджае вялікая колькасць замежных гасцей: калектывы з Расіі, Украны, Сербіі, Польшчы, Малдавіі... Чакаем прадстаўнікоў з Кітая. З кожным годам фестываль поўніцца новымі мерапрыемствамі. Сёлета ў Ляскавічах упершыню адбудзецца ўручэнне памятнага знака «Ганаровы паляшук», гашэнне паштовай маркі. Плануецца правядзенне конкурсу «Прыгажуня Палесся», фотавыставы «Славутыя палешукі», конкурсу маладой сям'і і свята ручніка... Гэты вялізны праект нам дапамагаў увасобіць у жыццё цэлы шэраг прадпрыемстваў Беларусі. Асноўнымі арганізатарамі фестывалю выступаюць Брэсцкі і Гомельскі аблвыканкамы, Міністэрствы культуры, сельскай гаспадаркі і харчавання, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, інфармацыі, а таксама ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» і ААТ «Белаграпрамбанк». Галоўная мэта фестывалю — захаванне і папулярызацыя этнакультурных традыцый Палесся, вывучэнне і падтрымка гісторыка-культурнай спадчыны ўнікальнага рэгіёна, а таксама ўмацаванне творчых сувязей жыхароў палескага памежжа суседніх краін, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця турызму. Сам фестываль — гэта цуд. Усё, што робіцца на кожным падворку, на кожным конкурсе — гэта цуд, звязаны з народам і яго традыцыямі. Гэта такая радасць для простых людзей!

Гутарыла Ірына АСТАШКЕВІЧ,
фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Гомельскі сшытак